313505

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ:

## стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця

Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі

3-4 мая 2002 года

Гродна

У 4 частках

Частка 2

Гродна 2003

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*П.А.Трубчык*

*г. Мінск*

# МАНАРХІЧНЫ ДРУК – ГАЛОЎНЫ ПРАВАДНІК УРАДАВАЙ ШАВІНІСТЫЧНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў БЕЛАРУСІ ў 1907-1912 г.

Пры разглядзе нацыянальнага пытання вялікую цікавасць выклікаюць матэрыялы перыядычнага друку часу першых расійскіх рэвалюцый, з дапамогай якіх можна ўявіць гістарычныя рэаліі эпохі. Аналіз іх дазваляе вызначыць асноўныя пазіцыі ўрадавага лагера па нацыянальнай праблеме, раскрыць сутнасць палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму.

У беларускай гістарыяграфіі некаторыя аспекты вылучанай тэмы разглядаліся ў працах М.В.Біча і М.М.Забаўскага.

У перыяд 1907–1912 г. манархічны друк займаў пануючае становішча сярод іншых выданняў у Расійскай імперыі, у тым ліку і ў беларускіх губернях. Пасля разгону II Дзяржаўнай думы і прыняцця новага выбарчага закону (3 чэрвеня 1907 г.), які значна абмяжоўваў прадстаўніцтва ад польскага і яўрэйскага насельніцтва на выбарах, актывізавалася дзейнасць чарнасоценных партый і груповак. Пры дапамозе сваіх органаў друку («Окраины России», «Северо-западная жизнь», «Новое время» і інш.) яны падтрымалі ўрадавую шавіністычную палітыку. Асаблівасці гэтай палітыкі на Беларусі былі звязаны са спецыфікай сацыяльна-класавага, рэлігійнага і нацыянальнага складу насельніцтва, у першую чаргу пануючых класаў, і імкненнем царызму паменшыць ролю палякаў і яўрэяў у эканамічным жыцці краю. Такія пазіцыі ўрада цалкам супадалі з ідэалогіяй крайне правых чарнасоценных партый («Союз русского народа», «Русский окраинный союз», «Савет аб'яднання дваранства» і інш.), якія адстойвалі прынцып «Святая праваслаўная вера, неабмежаванае самадзяржаўе і Расія для рускіх».

Урадавыя чарнасоценныя органы друку, такім чынам, выступалі ў якасці галоўнага правадніка на Беларусі палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму. Яны лічылі, што «нам трэба прыняць захады, каб выкарыстаць усе магчымыя спосабы да ўсведамлення тысячамі апалячаных беларусаў, што яны ў карані сваім ніякіх адносін да палякаў не маюць, бо іх продкі прытрымліваліся той жа веры, што і рускія».

Гэтыя выданні адмаўлялі існаванне беларускай мовы і культуры. Газета «Новое время» адзначала, што «нацыянальнае самавызначэнне беларускага «племя» адбываецца па двух напрамках: праваслаўныя беларусы лічаць сябе рускімі, і яны не ведаюць паняцця «беларусы»; беларусы – каталікі змешваюць рэлігію з нацыянальнасцю, лічаць сябе палякамі і не ведаюць паняццяў «беларуская народнасць» і «беларускае самавызначэнне». У адносінах да беларускай мовы газета «Окраины России» пісала: «Існуе дзве формы рускай мовы: літаратурная і простанародная; да апошняй належыць і беларуская мова». Наконт з`яўлення літаратуры, якая выдавалася на беларускай мове, у гэтым жа артыкуле сцвярджаецца, што «беларускія кнігі напісаны не чыста беларускай мовай, а ў змяшэнні з польскай; што яны толькі надрукаваны рускімі літарамі, а правапіс і вымаўленне ў іх – польскія». Акрамя таго, газета пераконвала чытачоў у тым, «што беларусам свая мова не патрэбна, што асноўнай мовай для беларусаў павінна служыць толькі руская, і ніякая іншая. А калі іншая мова каму і патрэбна, то толькі палякам для таго, каб паланізаваць беларускі народ і аддзяліць яго ад вялікай рускай сям'і».

Такім чынам, у матэрыялах манархічнага друку беларуская мова не проста ігнаравалася, а ўвогуле адмаўлялася.

У беларускім і ўкраінскім нацыянальных рухах урадавыя сілы бачылі спробы падрыву «русской» народнасці. У артыкуле «Белорусский сепаратизм» «Северно-западная жизнь» сцвярджала, што калі беларускі нацыянальны рух або ўкраінскі дасягнуў бы сваіх мэт, то «рускія ў Расіі засталіся б у меншасці, а большасць была б на баку іншародцаў, і тады вялікая Расійская імперыя загінула б».

На старонках манархічнага друку газета «Наша ніва» паказвалася як «орган, які прапаведуе сепаратысцкія ідэі і цягне ўбогае існаванне на аб'едкі, якія яму кідаюць з польскага стала». Вядома, такія развважанні не мелі пад сабой ніякіх падстаў. Урадавыя чарнасоценныя органы друку любымі спосабамі і метадамі імкнуліся дэзарганізаваць праявы беларускага нацыянальнага адраджэння.

Пры гэтым, рэвалюцыя 1905-1907 гадоў разглядалася не як спроба звяржэння «таго ці іншага рэжыму», а як барацьба «іншародцаў на чале з яўрэямі» за панаванне ў «вялікай і непадзельнай Расіі».

Шавіністычная палітыка ўрада на старонках манархічных выданняў праявілася і ў адносінах да палякаў і яўрэяў. «Польская» тэма займала асаблівае месца. Газета «Окраины России» неаднаразова, выступаючы ад імя «беларусаў», адзначала, што «палякі паміж намі, беларусамі, элемент прышлы, як і яўрэі». У гэтым жа артыкуле сцвярджаецца, што «Беларусь – зямля руская, і пытанні,





РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

і інтарэсы тут могуць быць толькі рускія; ні культурных, ніякіх іншых інтарэсаў польскіх тут няма».

Манархічныя органы друку бачылі ў паляках галоўнага «ворага», які імкнецца да панавання ў краі. Фактычна ў кожным нумары таго ці іншага выдання крытыкавалася дзейнасць у краі польскіх партый і каталіцкага касцёла. «Новое время» ў артыкуле «Польско-католический натиск» пісала, што «Северо-западный край у гэты час ахоплены полымем барацьбы за веру і народнасць. Распальвае гэта полымя пераважна каталіцкае духавенства». Тут жа гаворыцца, што «пад кіраўніцтвам біскупа Э.Ропа ўзнікла каталіцкая партыя, у праграму якой уваходзіць барацьба з праваслаўем, выгнанне рускіх чыноўнікаў, памешчыкаў, святароў і ўвогуле ўстанаўленне панавання польскага каталіцызма ў краі».

Такая ж пазіцыя на старонках манархічнага друку дамінавала і пры асвятленні дзейнасці дэпутатаў–«іншаверцаў» у Дзяржаўнай думе: «Палякі і іншародцы ўмела выкарыстоўваюць самыя нязначныя супярэчнасці ў Думе для распаўсюджвання сярод рускіх сумненняў у адзінстве рускага народа». Газеты неаднаразова сцвярджалі аб неабходнасці змяншэння або ўвогуле спынення прадстаўніцтва палякаў у Дзяржаўнай думе.

14 сакавіка 1911 года быў прыняты законапраект аб заходнім земстве. «Окраины России» з гэтай нагоды пісалі: «Увядзенне земскага самакіравання ў нашых заходніх губернях выклікала вядомы ўздым рускай самасвядомасці, што ў нас заўважаецца большай часткай у тых момантах, калі асабліва праяўляецца нацыяналізм іншародцаў...». На самай жа справе законапраект быў разлічаны на збліжэнне заможнай праслойкі беларускіх і ўкраінскіх сялян з рускімі памешчыкамі на платформе рускага нацыяналізму і аслаблення ўплыву польскіх памешчыкаў у краі. Сам факт увядзення царскім урадам «польскай» і «рускай» нацыянальных курый афіцыйна адмаўляў існаванне беларускай нацыі.

Такім чынам, манархічны друк у дадзены перыяд з'яўляўся адным з асноўных праваднікоў урадавай палітыкі. З перыядычным пастаянствам вялася барацьба з беларускамоўнымі выданнямі і ўвогуле з беларускім нацыянальным рухам. Адмаўлялася існаванне беларускай нацыі і культуры. У адносінах да палякаў, каталіцкага касцёла і яўрэяў была разгорнута агітацыя з мэтай адлучыць іх ад удзелу ў выбарах у Дзяржаўную думу. Манархічныя выданні патрабавалі ад урада ліквідаваць эканамічнае панаванне і аслабіць палітычны ўплыў польскіх землеўладальнікаў і яўрэйскай буржуазіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ